усвядомілі, што не трэба чакаць свайго 46-годдзя, а тварыць яго, бо "чалавек як знічка. Ён знікае, але і пасля смерці для нашчадкаў свеціць святлом сваіх спраў "[7]. І тады Леаніды вернуцца. Гэта, вядома, легенда, але рамантычная легенда, а каб не зачарсцвець душой, сцвярджаў Караткевіч, трэба верыць у легенды, не страчваць светлага і чыстага ўспрымання рэчаіснасці.

Героі твораў Караткевіча валодаюць вялікай прыцягальнай сілай, выклікаюць у чытачоў жаданне быць падобнымі да іх, будзяць жывую думку. "Іх духоўнае багацце і прыгажосць, маральная чысціня і беззаганнасць, вернасць перадавым грамадскім і эстэтычным ідэалам прываблiваюць і хвалююць нашага сучасніка, асабліва моладзь, у якой пісьменнік карыстаецца вялікай папулярнасцю"[8].

Духоўныя, маральна-філасофскія шуканні беларускіх пісьменнікаў стварылі светлавы калідор, у які вучні трапляюць пад уздзеяннем вялікай выхаваўчай магутнасці мастацкай літаратуры. "Справядлівасць, маральнасць, актыўнае адстойванне дабра, непрыманне зла. Народ, радзіма, -- вернасць ім да апошняга. Прыгажосць, каханне, любоў," — гэтымі словамі крытыка Я. Гарадніцкага нельга абмежаваць сістэму маральных каштоўнасцей у беларускай мастацкай літаратуры. Легендарнае і рэальнае, узнёслае і пабытавае, шырокае і звужанае, грамадскае і індывідуальнае -- сумесь аспектаў мастацкай літаратуры яшчэ ярчэй высвечвае праблемы маральных пошукаў аўтараў і іх герояў, неабходныя для назапашвання маральнага вопыту чалавецтва. І на гэтым шляху разам з імі маленькія чытачы-школьнікі, якім ладаваць будучыню нашай краіны, ад маральнага выбару якіх залежыць лёс Беларусі.

[1] Багдановіч А.Я. Материалы к биографии Максима Адамовича Богдановича // Беларуская літаратура: Даследаванні і публікацыі. - Мн., 1960. -- С. 176.
[2] Ул. Глыбінны. Пад лебядзіным знакам: Аповесць пра Максіма Багдановіча. - Нью-Ёрк, 1983. -- С. 13.
[3] Шкраба Р.В. Янка Купала // Беларуская літаратура: Падручнік для 9 кл. сярэдняй школы. - Мн., 1997. -- С. 12.
[4] Я. Купала. Жыве Беларусь. - Мн., 1993. - С. 413.
[5] Рагуля А. Методыка выкладання беларускай літаратуры. - Мн., 1986. - С. 8.
[6] Верабей А.Л. Жывая повязь часоў. - Мн., 1985. - С. 39.
[7] Тамсама, с. 40.
[8] Верабей А. Л. Жывая повязь часоў. - Мн., 1985. - С. 99.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Г.М. Зенава**

## РОЛЯ БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ ПРОЗЫ Ў СТАНАЎЛЕННІ АСОБЫ (на прыкладзе апавяданняў 1980 — 1990-х гг.)

Беларуская мастацкая літаратура — гэта не проста крыніца адлюстравання жыцця, але і дзейсны сродак выхавання, эстэтычнага ўздзеяння на пачуцці і свядомасць падрастаючага пакалення. Адна з

мэтаў, якую ставяць перад сабой беларускія пісьменнікі, — далучэнне моладзі да багацця беларускай мастацкай культуры, эстэтычнае спасціжэнне складаных чалавечых характараў праз вобразы мастацтва слова і фарміраванне на гэтай аснове сталых маральных перакананняў і актыўнай жыццёвай пазіцыі, дапамога ў станаўленні асобы. Сучасная беларуская літаратура, апавяданне ў тым ліку, адыгрывае значную ролю ў жыцці грамадства, узбагачае духоўны свет і пачуцці маладых людзей.

У беларускай прозе апошніх дзесяцігоддзяў у параўнанні з папярэднім перыядам адбыліся значныя мастацка-эстэтычныя змены і пачалі выяўляцца новыя тэндэнцыі (новыя тэмы, формы твора, тыпы герояў і антыгерояў, жанрава-стылявыя асаблівасці і г.д.), якія яскрава зафіксаваліся ў самым мабільным жанры, у жанры апавядання.

Закон эвалюцыі рэалізуецца ў “малым” жанры ў засваенні традыцый папярэдняй нацыянальнай і сусветнай навелістыкі, у абагачэнні і развіцці іх тэндэнцый, у стылявых узаемадачыненнях. З другой паловы 80-х і ў 90-я гады беларускія пісьменнікі імкнуцца ўвасобіць у “малой” прозе самыя складаныя духоўныя калізіі, ахапіць усю бязмежнасць чалавечых пачуццяў, перажыванняў і праблем. Пачынаецца пошук новай тэматыкі і стылістыкі твораў “малога” жанру. Спрадвечныя праблемы дабра і зла, паводзіны чалавека ў барацьбе за выжыванне і ў сучасных ваенных канфліктах, сацыяльныя, экалагічныя, дэмаграфічныя праблемы і шмат іншых адлюстроўваюцца ў апавяданнях беларускіх навелістаў.

Сучасная беларуская літаратура, у тым ліку і “малая” проза на новым узроўні распрацоўвае ідэю духоўнай і маральнай стойкасці асобы, ідэю сумлення. Менавіта сумленне вызваляе чалавека ад неасэнсаванага падпарадкавання знешняму ціску, ад прымусовага прытрымлівання абстрактных прадпісанняў. Яно ўзгадняе паводзіны чалавека з сапраўднымі маральнымі каштоўнасцямі, засцерагае яго ад памылак, якія тояць у сабе небяспеку. Так, у апавяданні Ягора Конева “Казырная шасцёрка” адзін з герояў вучыць другога: “На дзяржаву нельга працаваць. Яна выцісне з цябе ўсе сокі і пакіне падыхаць са смешнай пенсіяй. На свеце існуе толькі адна каштоўнасць – ты сам. Пакуль не зразумееш гэтага – застанешся быдлам”[1]. Праз лёс свайго героя Віктара Я.Конеў вяртае чытача да асноў хрысціянскай маралі, да яе запаведзі: ”Не забі!” Віктару прапанавалі за вялікія грошы дапамагчы разабрацца з яго босам і аднакласнікам Вадзімам, якога ён не любіў. Гэта была д’яблава спакуса, на якую герой не пагадзіўся. Выратоўваючы Вадзіма, Віктар духоўна выратаваў сябе, ачысціўся ад маральных заган. Канстатацыя героем, здаецца, прапісной ісціны, што грошы ў гэтым жыцці – не самае галоўнае, сведчыць пра тое, што ў сучасным жыццёвым хаосе ён не страціў сябе, не згубіў перспектыву духоўнага развіцця. Герой другога апавядання Я.Конева “Справа на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сорак тысяч” сцвярджае, што кепска жыць на Беларусі без даляраў. Аўтар падрабязна знаёміць нас з жыццём валютчыкаў і прадпрымальнікаў праз свайго героя Марата Рыжыка (Рыжык – мянушка), які спачатку быў валютчыкам, а потым, калі такі бізнес страціў усялякі сэнс, перасеў у драўляную камерцыйную краму. З апавядання можна даведацца, якія жудасныя парадкі і канкурэнцыя існуюць паміж так званымі калегамі па бізнесу і як не губляюцца з цягам часу сапраўдныя сяброўскія адносіны. Твор пранізаны пафасам маральна-духоўнага абнаўлення і ўмацавання асобы. Я.Конеў – цікавы малады празаік “новай хвалі”, ён плённа даследуе ўздзеянне навукова-тэхнічнага прагрэсу на фарміраванне характару сучаснага чалавека.

Праблема выхавання моладзі хвалюе пісьменніка Уладзіміра Міхно. У апавяданнях “Горкі зефір”, “Вераснёвая пара”, якія ўвайшлі ў зборнік прозы “Горкі зефір” (1993), аўтар імкнецца раскрыць праблемы і радасці падлетка, яго няпросты духоўны свет. У апавяданні “Тубік” У. Міхно вельмі рэалістычна адлюстроўвае паводзіны сучаснага чалавека ў экстрэмальнай для яго сітуацыі, узнімае праблему маральнага выбару.

Проза маладых, якія ў свой час уваходзілі ў групоўку “Тутэйшыя”, несла на сабе навізну бачання, утрымлівала элементы эпатажу, свядомага выкліку. Празаікі “новай хвалі” імкнуліся даказаць, што яны – іншыя, а іх проза -- альтэрнатыўная, традыцыйная ж беларуская проза ў іх атаясамлівалася з кансерватызмам мыслення, з дыскрэдытаванай, як здавалася, сацыялістычнай ідэяй. Заслугай літаб’яднання “Тутэйшыя” можна лічыць тое, што яны першымі пачалі пісаць на забароненыя раней тэмы, асвятляць “ценявы” бок жыцця. Маладыя літаратары вылучаліся арыгінальным пунктам погляду на свет і на людзей.

У гэтую групоўку ўваходзіў і Алесь Асташонак. Ён не проста фіксуе новыя з’явы жыцця, але і паглыбляецца ў іх псіхалагічны і сацыяльны сэнс, у духоўную сферу. Творы А.Асташонка, у якіх адлюстроўваецца рэчаіснасць, напісаны ў жанры рэалістычнай прозы. Апавяданне “Супер” было створана ў пачатку “перабудовы”, а апублікавана толькі праз тры гады, у 1988 г., магчыма таму, што ў ім набываюць выразны характар негатыўныя тэндэнцыі ў маладзёжным асяроддзі. А.Асташонак добра адчувае псіхалагічныя матывы паводзін сваіх герояў, такіх розных па сваім сацыяльным статусе, па сваіх адносінах да жыцця. Творчая ўдача аўтара – галоўны герой Супер, які гатовы браць ад жыцця ўсё самае лепшае, але толькі для сябе. Герой А.Асташонка выдатна вучыцца, захапляецца філасофіяй, падтрымлівае добрую фізічную форму і поўнасцю апраўдвае сваю мянушку Супер, якую яму далі ў інстытуце. Яго перавагу адчуваў кожны. За мэтанакіраванасць, з якою Супер пачынаў жыццё, бацька



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ласкава зваў яго маладым ваўком. У жыцці ён марыў мець прыстойнае месца працы ў прэстыжным офісе, каб не прыходзілася стаяць у чарзе ў прадуктовым магазіне. Дзеля гэтага, а не ў імя нечага вышэйшага гатовы Супер ахвяраваць свае розум і здольнасці. Аўтар пабудаваў апавяданне па прынцыпах кантрасту, што дазволіла яскрава ўбачыць сутнасць характараў дзеючых асоб. Сапраўднае аблічча Супера праявілася ва ўзаемаадносінах з былымі "зэкамі" Кляшчом і Нінкай. Трапіўшы ў непрыемную гісторыю, ён аказаўся не здольны на мужны мужчынскі ўчынак, павёў сябе як баязлівец, як звышэгаістычны чалавек. Усё, што з ім здарылася, Супер успрымае, як жахлівы сон, маральнага ачышчэння героя не адбываецца, наадварот, ён вырашае быць вышэйшым за астатніх ва ўсім, дзеля чаго гатовы без стомы працаваць над сабой.

Сучаснік паўстае ў апавяданні як герой-шукальнік сапраўднай чалавечай духоўнасці і можа вырасці ў самастойны вобраз, які як бы не залежыць ад аўтарскай волі і дзейнічае адпаведна свайму светаўспрыманню або наадварот — поўнасцю зліваецца з аўтарскім "Я". Ёсць шэраг апавяданняў, у якіх вобраз асноўнага героя застаецца неразгаданым, незразумелым, захаваным ад чытача да самага фіналу. "Малая" проза ўважлівей паставілася да паказу жыцця людзей з паламаным лёсам, з цяжкім характарам, да людзей, якія апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі. Праз вобраз сучасніка апавяданне празаікаў "новай хвалі" ў той ці іншай меры перадае непаўторнасць і складанасць сённяшняга часу, дае магчымасць прасачыць агульныя тэндэнцыі ў развіцці грамадства і станаўленні асобы. "Малая" проза канца XX ст. наблізілася да больш адэкватнага адлюстравання рэчаіснасці, нетрадыцыйна, авангардна, па-філасофску заглыблена, выкарыстоўваючы элементы псіхааналізу, паклікала ў глыбіні Космасу душы чалавека і бясконцыя далі Сусвету.

У апавяданнях другой паловы 80-х гадоў выразнай становіцца тэндэнцыя дэмакратызацыі героя, пазбаўленне ад манументальнасці ў яго абмалёўцы. Героі твораў спадзяюцца, што ў працэсе перабудовы і гуманізацыі жыцця адродзіцца сацыяльная справядлівасць, пераасэнсуюцца догмы і стэрэатыпы мінулага, а сам чалавек-працаўнік здольны будзе змяніць сваё жыццё да лепшага. Пісьменнікі акцэнтуюць увагу на росце самасвядомасці чалавека і нацыі ўвогуле. Агульным для ўсіх тыпаў герояў у сучасным апавяданні з'яўляецца тое, што ўсе яны трапілі пад уздзеянне анамалій нашага сённяшняга жыцця з яго маральным разлажэннем, атупеннем і абыякавасцю часткі прадстаўнікоў грамадства.

У папярэднія перыяды развіцця апавядання духоўнае багацце чалавека, паўната яго ўнутранага свету, дыялектыка душы не выступалі асноўным паказчыкам каштоўнасці яго асобы. Сучасныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыццёвыя абставіны і праблемы змянілі і сам тып героя і яго вызначальныя духоўныя параметры.

У сучаснай "малой" прозе можна вылучыць некалькі тыпаў літаратурных герояў. Адзін з іх можна бачыць на прыкладах з твораў А.Асташонка, герой у сацыяльным плане характарызуецца тым, што імкнецца процістаяць разлажэнню, дэградацыі грамадства, ён як бы ідзе супраць патоку жыцця, ён не такі, як усе. Гэта цэльная асоба, якая думае пра шляхі і сродкі барацьбы са злом. Возьмем для прыкладу апавяданне А.Асташонка "Launch"Ператварэнне", жанр якога вызначаецца як "маленькая антыутопія". Галоўны герой твора Алекс у перыяд, калі ідзе дэгуманізацыя грамадства, паўсюднае разбурэнне жыццёвых каштоўнасцяў, "жадае абудзіць беларусаў" ад нацыянальнага самазабыцця, нават цаною свайго жыцця. Ствараючы выдуманую, фантастычную сітуацыю для свайго героя, празаік на інтэлектуальна-філасофскім узроўні разважае пра стан нацыянальнай, грамадскай свядомасці. Фантастычная алегорыя А.Асташонка выкрывае сацыяльныя і душэўныя хваробы грамадства, такія як: незадаволенасць сваім жыццём, разгубленасць, неўтаймаванасць, раздвоенасць.

У вобразе героя-сучасніка адлюстраваліся і складанасць уваходжання новага ў звыклае жыццё, і ўчэпістасць аджылога, старога, і праблемы асабістага жыцця на пераломе эпох. З цягам часу ідэя перабудовы ў беларускай мастацкай літаратуры змянілася на ідэю нацыянальнага адраджэння і абуджэння самасвядомасці нацыі. Пісьменнікі ў 80-я гады імкнуцца спасцігнуць сутнасць гэтай ідэі, усвядоміць патрыятычныя інтарэсы беларускага народа, правільна расставіць у сваіх творах гуманістычныя акцэнты. Кожны з празаікаў "новай хвалі" на ўзроўні свайго таленту выразна акрэслівае сваю асабістую пазіцыю, раскрывае сацыяльную і маральную сутнасць абранай тэмы, героя, вобраза. А.Асташонак, У.Арлоў, А.Федарэнка, А.Наварыч, А.Казлоў знаходзяць патрэбныя мастацкія сродкі, неабходныя словы, каб перадаць свой неспакой, трывогу з прычыны запаланіўшай людзей спажывецкасці, у тым ліку і да духоўнай культуры.

Працэс нацыянальнага адраджэння, які пачаўся ў другой палове 80-х — пачатку 90-х гадоў, мае непераўзыйдзенае значэнне для лёсу беларускай нацыі, яе мовы, літаратуры і культуры. Прафесар А.А.Лойка лічыць нацыянальнае адраджэнне адным з самых асноўных стымулаў развіцця Беларусі, выявай яе ідэй, настрояў. Некаторы час беларусізацыя ахоплівала ўсе сферы дзейнасці грамадства, затым паспяхова сышла на нет. На жаль, гэты працэс не дасягнуў свайго лагічнага завяршэння. Але "...адраджэнню заўсёды час. Бо паражэння яму няма, яно не можа быць выкасавана, якія ўказы ці законы ні прымай. Ёсць дзве ідэі, якія ў еўрапейскай цывілізацыі



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

непатапляльныя: ідэя хрысціянская і ідэя нацыянальная"[2]. Разглядаецца нацыянальная ідэя ў апавяданні Г.Багданавай "Тармазнутая". Галоўная гераіня Алеся адчувае сябе "шэрай нямой нікчэмнасцю", і ўсё праз беларускую мову. Яна не можа рашыцца загаварыць з незнаёмым чалавекам па-беларуску. Ёй вельмі падабаецца беларуская мова, але карыстацца ёю ў паўсядзённым жыцці Алеся не можа. Г.Багданава праўдзіва перадае душэўны стан сучаснай маладой жанчыны, паказвае, як цяжка ёй у гэтым свеце, безабароннай і вельмі ўражлівай. Хочацца думаць, што такая яе станоўчая гераіня, як Алеся, - цвет нацыі, яе будучае, што такая моладзь, як яна, зможа выстаяць і ў свеце, пазбаўленым годных чалавечых арыенціраў і маральных каштоўнасцей.

Сучасны нацыянальна-дэмакратычны рух у Беларусі на карце мастацкай літаратуры ўжо не ўяўляецца белай плямай. Апавяданню Г.Багданавай "Тармазнутая" сугучны твор А.Асташонка "Беларускі акцэнт", у якім узнімаецца тэма захавання сваіх нацыянальных моўных каранёў. Пісьменнік асэнсоўвае на першы погляд нябачную драму чалавека — эміграцыю ад роднай матчынай мовы. Толькі не вынішчальным застаецца беларускі акцэнт, які, па вобразным параўнанні А.Асташонка, як жывая травінка, што прабіваецца праз асфальт, нагадвае пра паходжанне чалавека.

Вельмі мала ў сучаснай "малой" прозе твораў, дзе пісьменнікі разважаюць пра грамадзянскі абавязак перад сваім народам, пра маральную адказнасць перад нашчадкамі, узнімаюць пытанні агульначалавечага значэння. Паварот да ўнутранага свету персанажаў з'яўляецца нават важнейшым, чым праўдзіва адлюстраваны сацыяльны канфлікт. Так, у апавяданні Міхася Куляша "Рэйс" (Маладосць. - 1999. - N 2) героем з'яўляецца звычайны вадзіцель Віктар, які згадзіўся на "левы" рэйс, каб зарабіць хоць трохі грошай, якіх заўсёды не ставала ягонай жонцы Ніне. У непрадбачаных абставінах ён паводзіць сябе як сапраўдны мужчына — ратуе ад гвалтаўнікоў маладзенькую дзяўчыну. Галоўны герой не можа не выклікаць сімпатыю і павагу, як кожны, хто ахвяруе сваім жыццём, бескарысна дапамагаючы іншым людзям. М.Кулеш у апавяданні "Рэйс" яшчэ раз нагадвае, што толькі любоў да людзей, жаданне дапамагчы бліжняму напаўняе сэнсам чалавечыя справы і ўсё жыццё.

Стварыць ёмісты характар, паказаць цікавага героя ў творы малой эпічнай формы – вялікая ўдача, але празаікі "новай хвалі" маюць ужо ў гэтым плане некаторыя эстэтычныя адкрыцці. Так, герой У.Сцяпана з апавядання "Вонкавае святло" адстойвае сваё права на самастойнасць, незалежнасць, непадабенства на іншых. Чалавек, які адстойвае сваё "Я", недатыкальнасць уласнай душы, больш ваяўнічы і агрэсіўны ў параўнанні з іншым жывёльным светам. Магчыма таму "герой пераважнай большасці твораў маладой прозы – скупы на



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праявы эмоцый, ставіць унутраныя бар'еры пачуццю суперажывання, свядома пазбаўляе сябе многіх жыццёвых радасцяў"[3]. Духоўныя пошукі маладога чалавека, якія часта заходзяць у тупік, інтэлектуальныя галаваломкі, унутраныя і знешнія супярэчнасці, няздзейсненыя мары, кампрамісы – гэта тыя рэаліі, у якія ўглядаюцца празаікі "новай хвалі", імкнучыся адшукаць вобразы станоўчых герояў нашага часу.

У працэсе шматвяковай практыкі былі выпрацаваны і выпрабаваны важныя жыццёвыя ісціны, якія сталі нормай народнай маралі, таму нельга пагарджаць імі. Іх бяруць за ўзор пісьменнікі новай генерацыі, якія ствараюць вобраз сучасніка. Праз мастацкую дасканаласць лепшыя апавяданні 80 — 90-х гг. узрушваюць, выклікаюць на роздум, выхоўваюць і маральна, і сацыяльна, і нават палітычна.

[1] Конеў Я. Казырная шасцёрка // Маладосць. - 1997. - N 3. - С.49.
[2] Яно ўзыдзе! // ЛіМ. - 1996. - 5 ліп. - С.5.
[3] Козіч В. Чалавек і прырода. - Мн., 1998. – С.98.

**М.А. Широкова**

## ВЗГЛЯДЫ Ф.М.ДОСТОЕВСКОГО НА ВОСПИТАНИЕ И ОБРАЗОВАНИЕ

Во время пребывания молодого Достоевского в Семипалатинской ссылке ему пришлось заниматься репетиторством в семье Мельчаковых. Ученица, по ее собственному признанию, досталась ему не очень способная, арифметика давалась ей с трудом. Достоевский был строг и настойчив в своих требованиях, но терпелив к детским выходкам своей ученицы. Он поощрял ее успехи небольшими гостинцами и старался пресекать любые конфликты.

К Достоевскому в 60-80-е гг. XIX в. за советами по воспитанию детей обращались родители и школьные учителя (что и послужило одним из толчков к изданию "Дневника писателя"). Великий князь Константин Николаевич попросил Достоевского повлиять на его детей: Константина (любимца писателя, ставшего впоследствии даровитым поэтом) и Дмитрия[1]. Достоевский интересовался положением детей на фабриках, посещал воспитательные дома, колонию для малолетних преступников, тюремный замок. На страницах "Дневника писателя" он давал критическую оценку воспитательной системе в этих заведениях и вносил свои предложения. Достоевский наблюдал за воспитанием детей в крестьянских, мещанских, купеческих и интеллигентских семьях, изучал жизнь детей, просящих милостыню. На страницах "Дневника писателя" помещались отклики на судебные де-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ